# Харавое «Рэха»

Галіна ВАСІЛЬЧАНКА

**Пры канцы мінулага года ў Мінску прайшоў I Беларускі фестываль-конкурс нацыянальнай харавой музыкі "Рэха", галоўным арганізатарам якога выступіў нядаўна створаны творчы цэнтр "BelArtSound" Беларускага саюза музычных дзеячаў (галоўны каардынатар праекта — Галіна Казіміроўская).**

Гэты фестываль-конкурс меў на мэце звярнуць увагу выканаўцаў на беларускую харавую музыку і паспрыяць яе папулярызацыі ў шырокіх колах слухачоў. Арганізатары праекта разглядалі яго як магчымасць для ўсіх удзельнікаў прадставіць на сталічнай сцэне свае творчыя дасягненні, атрымаць імпульсы для далейшага прафесійнага развіцця, наладзіць узаемныя кантакты.

Адметная музычная імпрэза, якая адбывалася ў краіне ўпершыню, выклікала вялікую грамадскую цікавасць. "Рэха" сабрала 35 вакальна-харавых калектываў з усёй Беларусі. Быў прадстаўлены ўвесь зрэз сучаснай айчыннай вакальна-харавой выканальніцкай культуры: вакальныя ансамблі, змяшаныя і аднародныя хары, калектывы прафесійныя і аматарскія, з акадэмічнай і народнай манерамі спявання, а таксама дзіцячыя і дзіцяча-юнацкія хары. Творчае спаборніцтва аб'яднала людзей розных узростаў — самаму малодшаму ўдзельніку было толькі шэсць гадоў, а самы дарослы ўжо адзначыў сваё 88-годдзе.

Конкурсныя праслухоўванні адбыліся ў канцэртнай зале Дзіцячай музычнай школы № 10 імя Я. А. Глебава. Дзякуючы агульнай зацікаўленасці і адказнасці кіраўніцтва школы на чале з дырэктарам, заслужаным дзеячам культуры Рэспублікі Беларусь Т. Куніцкай, на конкурсе была створана атмасфера цеплыні і добразычлівасці, усе ўдзельнікі і члены журы адчувалі клопат і павагу. Усё гэта вызначыла поспех новага мерапрыемства, якое прайшло на высокім творчым і арганізацыйным узроўні.

Прафесійнае журы, якое ўзначальвала дацэнт кафедры харавога дырыжыравання Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі Л. Шымановіч, вызначала пераможцаў конкурсу. Гран-Пры атрымаў Народны хор ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны і працы г. Барысава (кіраўнік В. Геаргіу), а першыя месцы — узорны дзіцячы хор "Тоніка" сталічнай ДМШ № 1 (кіраўнік А. Снітко, катэгорыя "Дзіцяча-юнацкія хары"), народны вакальны ансамбль "Вясна" г. Полацка (кіраўнік Т. Шыбуняева, катэгорыя "Вакальныя ансамблі"), народны хор Морацкага сельскага Дома культуры Клецкага раёна (кіраўнік — заслужаны работнік культуры Рэспублікі Беларусь Я. Піліпеня, катэгорыя "Народныя аматарскія змяшаныя хары"), народная харавая капэла БНТУ (кіраўнік А. Ісайкіна, катэгорыя "Акадэмічныя аматарскія змяшаныя хары"), маладзёжны хор "Brevis" Мінскага дзяржаўнага каледжа мастацтваў (кіраўнік С. Кунцэвіч, катэгорыя "Аматарскія аднародныя хары").

Усе гэтыя калектывы, а так сама ганаровыя госці фестывалю — ансамбль народнай музыкі "Валлчобнікі" пад

быша і камерны хор "Saluta-ris" пад кіраўніцтвам В. Янум — узялі ўдзел у гала-канцэрце, які з вялікім поспехам адбыўся ў Канцэртнай зале Клуба імя Ф. Дзяржынскага.

Прызнаючы вялікае музычна-асветніцкае значэнне фестывалю-конкурсу "Рэха" і яго духоўна-маральны патэнцыял, неабходна адзначыць і тое, што ён акрэсліў адну з галоўных сённяшніх праблем: недахоп выдадзенага нотнага матэрыялу, "хранічную" недаступнасць нот харавых твораў нацыянальных кампазітараў.

. Таму, маючы намер ладзіць гэтае мерапрыемства штогод, арганізатары праекта плануюць прыкласці, разам з Беларускім саюзам музычных дзеячаў, усе намаганні, каб вырашыць і гэтую важную праблему.



***На здымку: мужчынская група народнага хору Морацкага СДК Клецкага раёна.***

РЕПОЗИТОРИЙ